ВЫДАВЕЦКІ ЦЭНТР – КУРС НА ІНАВАЦЫІ
Пра развіццё прадпрыемства распавяла дырэктар РУП Інэса КЛІМАВА
Стар. 2

ЛІЦЭЙСКАЯ АТМАСФЕРА ДАПАМАГАЕ РУХАЦЦА НАПЕРАД
Гутарка з дырэктарам Ліцэя БДУ Ігарам ВАРАКСАМ
Стар. 4–5

БІЯМЕХАНІКІ З БДУ ВЯРТАЮЦЬ СЛЫХ
Інтэрв'ю з дэканам ММФ Сяргеем БАСЯКОВЫМ
Стар. 6

«ТРЭБА МЯНЯЦЬ ПОГЛЯД НА ЛІДАРСТВА»
Старшыня Савета зямляцтваў БДУ Гадам ЧАРЫЕЎ
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

27 лютага 2020 года, № 4 (2226)

Рэктар БДУ Андрэй Кароль на перамовах з рэктарам Каірскага ўніверсітэта Махамедам Асманам эль-Хоштам

БДУ актывізуе супрацоўніцтва з Егіптам

Кіраўнікі беларускіх ВНУ на чале з міністрам адукацыі прынялі ўдзел у Беларуска-егіпецкім форуме рэктараў.

Мерапрыемства прайшло ў рамках афіцыйнага візіту кіраўніка дзяржавы **Аляксандра ЛУКАШЭНКІ** ў Егіпет і было накіравана на рэалізацыю дамоўленасцяў паміж дзвюма краінамі ў галіне адукацыі і навукі.

Падчас форуму адбыліся шматлікія сустрэчы кіраўнікоў універсітэтаў, дзе былі разгледжаны і вызначаны новыя вектары супрацоўніцтва. У прыватнасці, **Андрэй КАРОЛЬ** распавёў калегам з Егіпта пра адукацыйны і навукова-тэхнічны патэнцыял БДУ, выступіў з прапановамі па рэалізацыі перспектыўных формаў узаемадзеяння ў галіне тэхналогій дадатковай і віртуальнай рэальнасці, 3D-рэканструкцыі аб'ектаў навакольнага асяроддзя, біятэхналогій, хіміі і фармацэўтыкі. Таксама рэктар БДУ наведаў Каірскі ўніверсітэт, дзе азнаёміўся з асаблівасцямі арганізацыі яго адукацыйнай, навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці. Бакі абмеркавалі пытанні актывізацыі супрацоўніцтва ў рамках падпісанай у 2004 годзе дамовы.

Акрамя таго, БДУ ў складзе калектыўнага раздзела навукова-тэхнічных распрацовак Міністэрства адукацыі прыняў удзел у працы ***выставы «Беларусь – Егіпет: партнёрства, звернутае ў будучыню»***, арганізаванай у рамках візіту Прэзідэнта Беларусі. На пляцоўках выставачнага комплексу было прадстаўлена каля 10 навукова-тэхнічных распрацовак беларускай ВНУ ў галіне аэракасмічных тэхналогій, прыборабудавання, фармацэўтыкі і ветэрынарыі.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт прадэманстраваў супрацьпухлінныя прэпараты *«Тэмадэкс», «Праспідэлонг», «Цысплацэл»*. Яны прымяняюцца для лячэння злаякасных пухлін, уяўляюць сабою гідрагелі, якія змяшчаюць імабілізаваныя цытастатыкі і імплантуюцца ў ложа выдаленай пухліны. Прэпараты выклікаюць гібель ракавых клетак, прадухіляюць метастазіраванне, спрыяюць зніжэнню таксічнай нагрузкі на арганізм.

Экспанатам выставы таксама стаў *«Высокатэмпературны аптычны тэрмограф ІТ-3СМ»*. Ён прызначаны для вымярэння тэмпературы гарачых прадметаў у дыяпазоне тэмператур ад +800 да +1700°С. Прыбор можна выкарыстоўваць у складзе вытворчых і эксперыментальных установак падчас бесперапыннага кантролю тэмпературы металаў пры каванні, штампоўцы, пракаце, наладцы і г. д.

На выставе дэманстравалася серыя ветэрынарных біяпрэпаратаў для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых жывёл. Гэта шматфункцыянальныя фармацэўтычныя прэпараты, якія валодаюць адначасова супрацьвіруснай, імунамадулюючай і антыбактэрыяльнай актыўнасцямі. Біяпрэпараты не маюць замежных аналагаў.

Выстава «Беларусь – Егіпет: партнёрства, звернутае ў будучыню» была разгорнутая н а базе комплексу «Аль-Маса-Кэпітал», на тэрыторыі якога знаходзіцца найбуйнейшы ў Афрыцы кангрэс-цэнтр.

20 лютага ў рамках дзелавой праграмы выставу «Беларусь – Егіпет: партнёрства, звернутае ў будучыню» наведалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі, а таксама міністр адукацыі Беларусі Ігар Карпенка**.**

У гэты ж дзень дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у пасяджэнні Егіпецка-беларускага бізнес-форуму. У рамках мерапрыемства прайшлі прэзентацыі навукова-тэхнічнага патэнцыялу, а таксама перспектыўных інвестыцыйных праектаў абедзвюх краін.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ,
Юлія ШАЛАМАВА

ПРЫЗНАЧЭННІ

Дэканам факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі прызначаны доктар тэхнічных навук Аляксандр НЕДЗЬВЕДЗЬ.

17 лютага ён быў прадстаўлены працоўнаму калектыву. Першы прарэктар БДУ *Дзмітрый Мядзведзеў* ад імя рэктара пажадаў новаму дэкану прафесійных поспехаў, умацавання брэнда ФПМІ як вядучага беларускага ІТ-факультэта. У сваім звароце Аляксандр Недзьведзь падкрэсліў важнасць калектыўнай кансалідацыі і выказаў спадзяванне на падтрымку супрацоўнікаў факультэта ў захаванні традыцый і далейшым развіцці падраздзялення. Значнасці ўніверсітэцкай падзеі надала ўрачыстая перадача Аляксандру Недзьведзю адных з галоўных атрыбутаў універсітэта – мантыі і канфедэраткі дэкана. Іх свайму паслядоўніку ўручыў дэкан 1996–2019 гадоў *Павел Мандрык* з пажаданнямі эфектыўнай і плённай працы на пасадзе кіраўніка ФПМІ.

Працоўнаму калектыву механіка-матэматычнага факультэта таксама прадставілі новага дэкана. Ім прызначаны доктар фізіка-матэматычных навук Сяргей БАСЯКОЎ.

Сяргей Міхайлавіч падзякаваў сваім папярэднікам, прафесарска-выкладчыцкаму складу, якія многае робяць для развіцця факультэта, яго ўнікальнасці і вядомасці. Кіраўнік ММФ назваў асноўны прынцып сваёй адміністрацыйнай працы, заснаваны на адкрытасці і галоснасці, падтрымцы цікавых прапаноў і новых ідэй. «Факультэт мае багатую гісторыю, традыцыі і сваю будучыню», – рэзюмаваў Сяргей Басякоў.

За якасную падрыхтоўку спецыялістаў, эфектыўную працу на пасадзе дэкана ММФ словы падзякі былі адрасаваны таксама *Дзмітрыю Мядзведзеву*, які ад студзеня бягучага года прызначаны на пасаду першага прарэктара БДУ. Ён пажадаў свайму пераемніку поспехаў. Прадстаўленне новага кіраўніка ММФ праходзіла ў гістарычнай аўдыторыі, дзе пачынаецца шлях кожнага студэнта.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
27 лютага 2020 года, № 4 (2226)

Выдавецкі цэнтр БДУ – курс на інавацыі

У 2001 годзе было створана сучаснае выдавецка-паліграфічнае прадпрыемства – Выдавецкі цэнтр БДУ. Менавіта тут друкуецца ўніверсітэцкая газета, а рукапісы даследчыкаў ператвараюцца ў кнігі. Чым яшчэ займаецца прадпрыемства і навошта ўсім – ад студэнта да прафесара – будзе карысна захаваць кантакт і адрас цэнтра, у нашым матэрыяле.

Наш адрас: г. Мінск,
вул. Чырвонаармейская, 6
тэл. (017) 327-87-71
pcbsu@yandex.ru
інстаграм: @izdatelskiitsentr

Вядучы інжынер Алег Грышын выводзіць вокладкі кніг на лічбавым друкавальным апараце

Два вектары развіцця

Выдавецкі цэнтр БДУ працуе ў двух асноўных напрамках: як выдавецтва поўнага цыкла і як тыпаграфія. Так, летась тут падрыхтавалі цэлых 19 падручнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дапаможнай і спецыяльнай школы на замову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

– Гэта даволі шмат, таму што падбораму на падрыхтоўку аднаго падручніка неабходна 3-5 месяцаў, – адзначае дырэктар цэнтра **Інэса КЛІМАВА.** – Праца нашых спецыялістаў пачынаецца з адаптацыі мовы тэксту, каб ён быў зразумелы школьніку. Затым малююцца ілюстрацыі, падбіраюцца і апрацоўваюцца фотаматэрыялы, ствараецца арыгінал-макет.

У выдавецкім цэнтры супрацоўнічаюць і наўпрост з аўтарамі.

– У гэтым выпадку мы таксама ажыццяўляем поўны цыкл рэдакцыйна-выдавецкіх і паліграфічных паслуг: ад стварэння арыгінал-макета да выпуску гатовага тыражу, – падкрэслівае Інэса Барысаўна. – Вялікі досвед выдавецкай дзейнасці дазваляе выпускаць паліграфічную прадукцыю любой складанасці і забяспечваць сціслыя тэрміны і высокую якасць з улікам пажаданняў самых патрабавальных аўтараў. Выпуск кожнага камерцыйнага выдання накіраваны на яго наступнае рэкламаванне, у тым ліку праз сацыяльныя сеткі, інтэрнэт-крамы, электронныя пляцоўкі і мабільныя дадаткі.

Што да тыпаграфіі, то ў цэнтры на ўласным сучасным абсталяванні ажыццяўляецца друк афсетным, лічбавым і трафарэтным (рызаграфія) спосабамі, усе неабходныя паслядрукавыя аперацыі. Вырабляюць шырокі спектр паліграфічнай прадукцыі: кнігі, брашуры, часопісы, газеты, аўтарэфераты, буклеты, каталогі, альбомы, календары, папкі, нататнікі з любых пераплётных матэрыялаў, а таксама іншую рэкламную паліграфію. Канкурэнтнымі перавагамі называюць нізкі кошт паслуг пры высокай якасці выканання. Напрыклад, для выданняў у мяккай вокладцы выкарыстоўваецца якасны нямецкі клей. Супрацоўнікі распавядаюць, што нават праводзілі кнігам краштэсты: кідалі на падлогу, каб трэснуў карэньчык, цягнулі старонкі – кожны ліст застаецца на месцы, таму ў якасці сваёй прадукцыі ўпэўненыя.

Інэса Клімава і начальнік вытворчасці Вольга Кузьміна-Зелянкевіч ацэньваюць якасць высякальна-бігавальнай машыны

Чарговы тыраж навучальных кніг на замову БДУ гатовы да адгрузкі

Курс на «сувенірку»

У выдавецкім цэнтры сочаць за тэндэнцыямі і адзначаюць, што з кожным годам попыт на традыцыйную паліграфію змяншаецца.

– Новым стратэгічным напрамкам развіцця мы абралі вытворчасць упаковачнай, сувенірнай і рэкламнай прадукцыі. Для гэтага набылі сучаснае абсталяванне, – распавядае Інэса Клімава. – Літаральна надоечы нам ужо прывезлі высякальна-бігавальную машыну, на якой можна выразаць любыя формы, а потым складаць, напрыклад, падарункавыя пакеты, скрыначкі, канверты, папкі. Усё-такі прэзентабельная ўпакоўка можа ўдала дапоўніць любую прадукцыю. Другая «машына» – УФ-прынтар – будзе дастаўлена нам на працягу некалькіх месяцаў. Яна даволі ўнікальная: у нашай краіне такіх не больш за дзесяць. З дапамогай ультрафіялетавага друку (з выкарыстаннем спецыяльнага чарніла) можна наносіць малюнкі на нарыхтоўкі з любога матэрыялу і формы, ствараць разнастайныя тэкстуры.

Новы УФ-прынтар дазволіць рабіць выбарачную лакіроўку...



...а таксама друкаваць:

на чахлах,

на фанеры,

на шкле,



на пластыку,



аб'ёмныя выявы

У планах на гэты год – укараненне новых фарматаў працы і прымяненне пашыранага інструментарыю для выпуску і рэалізацыі рознага роду літаратуры, а таксама фотаальбомаў прадстаўнічага класа ў папяровым выглядзе і на электронным носьбіце.

Арыентацыя на кліента

Звярнуцца па паслугі ў выдавецкі цэнтр можа кожны: ад студэнта да акадэміка. Не ўсе, напрыклад, ведаюць, што тут можна даволі бюджэтна сшыць у цвёрдую вокладку дыпломную працу, а навукоўцам прапануюць зрабіць вокладку дысертацый 7Б – тую самую, што патрабуе ВАК.

– Паслугі па вокладцы фізічным асобам мы падаём увесь час, а нядаўна для выгады кліентаў набылі высакахуткасную мультыфункцыянальную прыладу Xerox, на якой можна раздрукаваць, напрыклад, арыгінал-макеты для вокладак дысертацый, – адзначае Інэса Барысаўна. – Друкуем і сшываем аўтарэфераты дзень у дзень, што асабліва актуальна для аўтараў з рэгіёнаў. Дарэчы, у нас ёсць тэрмінал, таму ніякіх праблем з аплатай не ўзнікае.

Асноўны профіль цэнтра – навучальная і навучальна-метадычная, навуковая і навукова-папулярная літаратура, але вырабіць тут могуць практычна любы від друкаванай прадукцыі.

– У нашым каталогу ёсць нават выпускныя альбомы. Гэты прадукт мы распрацоўвалі, арыентуючыся на выпускнікоў БДУ, але цяпер імі актыўна цікавяцца і школы, – распавядае Інэса Клімава. – Наогул, нам важна ведаць, якія яшчэ запыты па выдавецка-паліграфічным профілі ёсць у выкладчыкаў і студэнтаў. Мы адкрытыя да супрацоўніцтва і гатовыя абдумваць новыя прадукты і паслугі, калі будзе попыт.

З клопатам пра супрацоўнікаў

Заняўшы пасаду дырэктара цэнтра ў сакавіку 2018 года, Інэса Клімава адразу азадачылася ўдасканаленнем умоў працы для супрацоўнікаў.

– Памяшканні выкарыстоўваліся нерацыянальна, стаяла шмат старой, непрацуючай тэхнікі. Было відавочна, што наспела неабходнасць рамонту і перапланіроўкі памяшканняў, – адзначае Інэса Барысаўна. – За два гады нам удалося зрабіць многае: памянялі дзверы і вокны, аднавілі паркет, уладкавалі кабінеты. Важна, што ўсё гэта – за кошт уласных сродкаў.

Размаўляючы з супрацоўнікамі, разумееш, што людзі тут захоплены сваёй справай, а значыць, працуюць эфектыўна. Пра гэта гаворыць і рост паказчыкаў прадукцыйнасці працы і выручкі. Прадпрыемства працуе і зарабляе, што дазваляе не толькі рабіць рамонт памяшканняў, але і абнаўляць тэхніку, якая ў выдавецкай справе патрабуе немалых укладанняў. Ёсць упэўненасць, што своечасовая пераарыентацыя на запатрабаваныя напрамкі дазволіць Выдавецкаму цэнтру БДУ паспяхова канкурыраваць на рынку паслуг.

Валерыя БАНДАРЧЫК

На ФФСН адкрылі імянную аўдыторыю акадэміка В. С. Сцёпіна

Чалавек універсальнага інтэлекту

Угонар выбітнага навукоўца-філосафа, акадэміка РАН і ганаровага прафесара БДУ на факультэце філасофіі і сацыяльных навук адкрылі музей у 524 аўдыторыі, якой прысвоілі яго імя. У чым веліч гэтай асобы і значэнне яго інтэлектуальнай спадчыны, гаварылі вучні, паплечнікі і сябры.

Стрымаць абяцанне

Год назад, сабраўшыся ўшанаваць Вячаслава Сямёнавіча Сцёпіна, які пайшоў з жыцця, кіраўніцтва і выкладчыкі ўніверсітэта вырашылі ўвекавечыць памяць пра акадэміка імянной аўдыторыяй. Яна сімвалічна адкрылася 25 студзеня: да Дня беларускай навукі. Калегі і вучні Сцёпіна – вядомыя філосафы, выкладчыкі і кіраўнікі факультэта – успомнілі акадэміка і абмеркавалі яго важкі ўнёсак у навуку. Выказаўся дэкан факультэта **Вадзім ГІГІН:**

– Гэта выбітны філосаф краіны, чалавек, які стаў сімвалам ФФСН, усяго філасофскага напрамку Беларусі. Адзін з самых цытаваных гуманітарыяў на постсавецкай прасторы, яго кнігі перакладзены на англійскую, іспанскую, французскую, нямецкую мовы. Вячаслаў Сямёнавіч зрабіў велізарны ўнёсак у развіццё ўсіх гуманітарных навук. Год таму яго не стала – гэта вялікая страта, якую мы адчуваем дагэтуль. Надалей экспазіцыя будзе пашырана экспанатамі, якія не толькі належалі Сцёпіну, але і адлюстроўваюць інтэлектуальную гісторыю нашай краіны і ўніверсітэта.

У аўдыторыі прадстаўлены працы і асабістыя рэчы акадэміка: мантыя, пісьмовы набор, выпускны студэнцкі фотаальбом, па той, мінулай традыцыі, дыпломы, а таксама фатаграфіі, якія адлюстроўваюць шлях Вячаслава Сямёнавіча ад студэнта да ўшаноўвання ў сценах БДУ. Акрамя таго, сям'я акадэміка перадала ў дар факультэту кнігі з яго асабістай бібліятэкі, ёсць на кніжнай паліцы і яго навуковыя працы.

Аўдыторыя стане ўнікальнай пляцоўкай для арганізацыі педагагічнай і навучальнай дзейнасці з выкарыстаннем фонду навуковых прац акадэміка. З абсталяваннем дапамаглі рэктарат і цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ. У планах факультэта стварыць паўнавартасныя Сцёпінскія чытанні, бо цяпер гэта толькі секцыя на навуковай канферэнцыі. На доме на вуліцы Сурганава, дзе жыў Вячаслаў Сямёнавіч, плануюць павесіць мемарыяльную дошку.

Першаму прарэктару **Дзмітрыю МЯДЗВЕДЗЕВУ** пашчасціла вучыцца ў Вячаслава Сямёнавіча



на 5 курсе. Ім, студэнтам, хацелася быць такімі ж, як Сцёпін, але здавалася, што падобнымі быць немагчыма. Студэнты, сутыкаючыся з такімі асобамі, растуць: «Гэта быў чалавек, які памерам сваёй асобы пераўзыходзіў універсітэт. Не БДУ маленькі, а Сцёпін быў вялікі». Па словах прарэктара, ён дагэтуль памятае голас акадэміка, які ў 1979 годзе пачуў у першы раз.

«Кніга стала аддушынай»

Загадчык кафедры сацыялогіі **Аляксандр ДАНІЛАЎ** лічыць акадэміка сваім настаўнікам і апублікаваў артыкулы, прысвечаныя перыядам творчасці Вячаслава Сямёнавіча ад Далёкага Усходу да Лісабона. А сёлета стаў складальнікам кнігі «Акадэмік В. С. Сцёпін. Таямніца доўгага шляху...». У кнізе асвятляецца жыццёвы і творчы шлях філосафа, прадстаўлены размовы, інтэрв'ю, успаміны сучаснікаў, архіўныя дакументы і рэдкія фатаграфіі.

– Гэты год быў цяжкі, сыход Вячаслава Сямёнавіча стаў для мяне трагедыяй, дагэтуль ідзе працэс асэнсавання маштабаў страты, па сутнасці яна яшчэ не ацэнена. Праца над кнігай стала для мяне аддушынай. У навуцы і адукацыі рухае аўтарытэт Настаўніка. Гэта адчуванне аўтарытэту Сцёпіна было і застаецца такім моцным. Кожны, хто мог, уносіў у кнігу свой уклад, тое, з якім жаданнем усе гэта рабілі, гаворыць пра многае. У нас сёння шмат школ, а ідэй нямнога.

Стары сябар

На адкрыцці аўдыторыі былі не толькі вучні акадэміка, але і сябры. Адзін з іх – **Яўген БАБОСАЎ,** доктар філасофскіх навук, акадэмік НАН, старшыня Беларускага філасофскага таварыства. Ён пазнаёміўся са «Славам» яшчэ на сваім другім курсе, разам заканчвалі аспірантуру. У іх жыцці былі розныя перыяды: то збліжаліся, то разыходзіліся, але Яўген Міхайлавіч, бываючы ў Маскве, нязменна заходзіў на пасяджэнне да Сцёпіна. Яны ніколі не сварыліся, але часта спрачаліся па-навуковаму – погляды не супадалі. Сапраўдная філасофія спасцігаецца не ў глыбіні і цішыні бібліятэкі, як бы гэта ні здалося дзіўным – яна ўзнікае, калі дыскутуеш з кімсьці, аргументы адразу ўсплываюць, нараджаюцца ідэі. Глыбіня пазнання філасофіі вымяраецца не ў апублікаваных кнігах, а ў сутыкненні меркаванняў, толькі яно прыводзіць да праўды.

Інтэлект асобы, які стаў універсальным

Пра ролю акадэміка Сцёпіна, яго ўнёсак і асобу распавёў **Анатоль ЗЕЛЯНКОЎ,** загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі навукі:

– Вячаслаў Сямёнавіч Сцёпін належыць сусветнай філасофскай супольнасці. Яго жыццё падзяліла значная прапорцыя: 31 год у Беларусі і столькі ж у Расіі. Нам выпала велізарная жыццёвая ўдача працаваць, вучыцца ў чалавека, які справядліва ўвайшоў у гісторыю. Рэдка каму з філосафаў, навукоўцаў удаецца стаць сапраўдным лідарам навуковай школы. Яго імя застанецца не толькі ў нашай удзячнай памяці, але і ў гісторыі. Чалавечыя адносіны – гэта рэч у сабе, у іх гэтулькі граняў, і ніколі ўсё не выфарбавана белым колерам. Але на выхадзе мы маем магчымасць успамінаць з пакланеннем перад веліччу яго інтэлектуальнай моцы. В. С. Сцёпіна называлі «інтэлектуальнай машынай». Ён быў абаяльны, бліскуча ведаў паэзію, мог супераживаць, быў часта па-дзіцячаму наіўным і неабароненым, меў патрэбу ў разуменні. Тое, што мы адкрылі аўдыторыю, азначае пачатак матэрыялізацыі памяці пра Вячаслава Сямёнавіча.

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў **Ігар МАРЗАЛЮК** звярнуў увагу на настаўніцтва і інтэлект акадэміка:

– У канфуцыянскай этыцы ёсць паняцце «сяа» – сыноўская пачцівасць, павага да настаўніка. Бо настаўнік – гэта не толькі лектар, мерчандайзер ведаў, не абслуговы персанал для тых, хто прыходзіць нешта атрымліваць. Прафесар – гэта заўсёды настаўнік і чалавек, які прадуцыруе сэнсы, рыхтуе інтэлектуальную эліту нацыі. І гэту годную ролю Вячаслаў Сямёнавіч выконваў напоўніцу. Каласальнае дасягненне любой культуры – калі інтэлект асобы становіцца ўніверсальным, як і адбылося са Сцёпіным.

Надзея МАРХЕЛЬ

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

01 сакавіка Піліпчук Людміла Андрэеўна, дацэнт кафедры камп'ютарных тэхналогій і сістэм
02 сакавіка Еравенка Валерый Аляксандравіч, прафесар кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі
04 сакавіка Вярвільская Вольга Мікалаеўна, дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі
08 сакавіка Палякоў Аляксандр Уладзіміравіч, дацэнт кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій
08 сакавіка Філіпава Святлана Мікалаеўна, дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін
18 сакавіка Недзьведзь Аляксандр Міхайлавіч, дэкан ФПМІ, загадчык кафедры камп'ютарных тэхналогій і сістэм
19 сакавіка Анішчык Віктар Міхайлавіч, прафесар кафедры фізікі цвёрдага цела
19 сакавіка Алейнік Лада Віктараўна, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры
23 сакавіка Гафараў Хасан Сабіравіч, прафесар кафедры камунікатыўнага дызайну
23 сакавіка Каскевіч Віктар Іванавіч, дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі
23 сакавіка Кузьміч Ірына Пятроўна, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права
27 сакавіка Філіпава Нэлі Канстаўцінаўна, дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі
31 сакавіка Лагодзіч Аляксей Віктаравіч, дацэнт кафедры генетыкі

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: арганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, міжнароднай палітычнай эканоміі, рускай літаратуры.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: мікрабіялогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, тэарэтычнай і прыкладной механікі, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, перыядычнага друку і вэб-журналістыкі, неарганічнай хіміі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, фізічнага выхавання і спорту, сацыялогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм, агульнай фізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, фізічнага выхавання і спорту, тэорыі і практыкі перакладу, нямецкай мовы, філасофіі і метадалогіі навукі, псіхалогіі, інфармацыйных тэхналогій, камп'ютарнага мадэлявання, крыніцазнаўства, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, германскіх моў, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу.

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці, фізічнага выхавання і спорту.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.

ІНСТЫТУТ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ І ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ СУДДЗЯЎ, РАБОТНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ, СУДОЎ І ЎСТАНОЎ ЮСТЫЦЫІ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ судовай дзейнасці;
ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ судовай дзейнасці.
Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, д. 14, к. 315. Тэл. 327 40 56.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Адзіны ў свеце гідрагелевы супрацьпухлінны прэпарат «Тэмадэкс» будзе ствараць ў БДУ – БелТА, sb.by, zviazda.by, tvr.by, АНТ, «Спадарожнік», «Інтэрфакс», 1prof.by, «Экапрэс», tut.by, news.21.by, rg.ru, yandex.by (10.02), radio1.by, «Мінск-Навіны» (11.02), тэлеканал «Мир 24» (14.02) , Беларусь-1 (18.02).

Ветэрынарны прэпарат «Цыпрапіг» распрацаваны ў БДУ – БелТА, agronews.com, yandex.by (30.01).

Каманда БДУ «Дзеці Цьюрынга» ў Вышэйшай лізе КВЗ – БелТА, sb.by, news.21.by (24.01), zviazda.by, aif.by, yandex.by (25.01).

Унікальная распрацоўка навукоўцаў БДУ праходзіць выпрабаванні на Міжнароднай касмічнай станцыі – sb.by, yandex.by (05.02), БелТА, zviazda.by, souzveche.ru, news.21.by, «Экапрэс», gp.by, rg.ru (06.02), «Звязда» (11.02).

Каманда БДУ выступіць на Міжнародным юрыдычным конкурсе імя Ф. Джэсапа ў ЗША – БелТА, sb.by, «Тэлеграф», «Экапрэс» (11.02).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях інфармуе

На жаль, у паўсядзённым жыцці здараюцца пажары. Большасць загаранняў адбываецца з прычыны чалавечай бестурботнасці і грэбавання правіламі бяспекі. Толькі за студзень 2020 года ў краіне адбылося 439 пажараў, на якіх загінуў 81 чалавек.

Выявіўшы загаранне, неабходна неадкладна выклікаць выратавальнікаў МНС. Гэта варта зрабіць з бяспечнага месца. Набраць нумар выратавальнікаў «101» ці «112» і паведаміць наступныя звесткі:

– адрас, дзе выяўлена загаранне;

– аб'ект, дзе адбываецца пажар: у дварах, у кватэры, у школе, на складзе і г. д.;

– што канкрэтна гарыць: тэлевізар, мэбля, аўтамабіль (калі дыспетчар папросіць, удакладніць: нумар дома, пад'езда, кватэры, на якім паверсе гарыць, колькі паверхаў у будынку, адкуль зручней пад'ехаць, код для ўваходу ў пад'езд, ці ёсць небяспека для людзей і г. д.);

– сваё прозвішча і тэлефон.

Не панікаваць, гаварыць па тэлефоне выразна і спакойна. Ведайце, што, пакуль вы паведамляеце пра пажар, выратавальныя падраздзяленні ўжо едуць да месца выкліку (усе неабходныя звесткі выратавальнікам перададуць па рацыі).

Каб захаваць сваю маёмасць і жыццё ад вогненных надзвычайных сітуацый, рэкамендавана ўсталёўваць у жыллё аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Дзякуючы яму выратавана нямала чалавечых жыццяў.

Інспектар СПУГ Маскоўскага РАНС МДУ МНС Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ

УНІВЕРСІТЭТ
27 лютага 2020 года, № 4 (2226)



Ліцэйская атмасфера дапамагае заўсёды рухацца наперад

Вось ужо 30 гадоў у Ліцэі БДУ навучаюць і выхоўваюць таленавітую і адораную моладзь. Сёння гэта ўстанова адукацыі дае профільнае навучанне, мае сучаснае абсталяванне і арыгінальныя метады выкладання. З якімі вынікамі падышоў ліцэй да круглай даты, распавёў дырэктар установы **Ігар ВАРАКСА.**

ПАСТУПЛЕННЕ

– Каб паступіць у ліцэй, трэба мець высокі ўзровень падрыхтоўкі, бо сярэдні конкурс складае каля 7 чалавек на месца, а на некаторыя профілі – да 10. Скажыце, ці заўсёды была такая высокая планка?

– Мы кожны год аналізуем колькасць абітурыентаў. Апошні час да нас паступае прыкладна 1,5 % ад тых, хто заканчвае базавую школу. Зараз каля 100 тысяч дзяцей выпускаецца з 9 класа, і 1500 спрабуюць паступіць у ліцэй. Гледзячы на статыстыку за апошнія 20 гадоў, можна сказаць, што вялікі конкурс быў заўсёды. Нават калі я паступаў у 1993 г., таксама было шмат абітурыентаў. Я конкурсу не адчуў, таму што мяне запрасілі па выніках рэспубліканскай алімпіяды па фізіцы. Але бацькі мяне не пускалі ў Мінск, таму што ліцэй у той час быў яшчэ невядомы, яму было толькі 3 гады. Таму мы дамовіліся, што калі я паступлю праз уступныя іспыты, то мяне адпусцяць. Так мне прыйшлося паступаць не толькі па алімпіядзе, а яшчэ і другі раз самастойна. І я паступіў.

– Як Вы думаеце, чаму так шмат школьнікаў імкнецца патрапіць да вас? І ці маюць шанец тыя, у каго невысокія балы ў атэстаце?

– Шчыра лічу, што мае значэнне рэпутацыя ліцэя як выдатнай установы адукацыі, а гэта рэпутацыя фарміравалася на працягу 30 гадоў. Пасля заканчэння Ліцэя БДУ выпускнікі кажуць пра тое, што тут асаблівая атмасфера ўзаемапавагі. Але калі яны толькі паступаюць, то пра гэта не ведаюць, іх больш цікавяць знешнія атрыбуты.

Да нас можа паступіць любы вучань. Для паступлення ў Ліцэй БДУ трэба здаць толькі два іспыты па профільных прадметах, на якіх можна набраць максімум 200 балаў. Пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах залічваюцца ў Ліцэй БДУ без экзаменаў. Па выніках уступных іспытаў, напрыканцы мая, мы складаем спіс рэкамендаваных да залічэння. У мінулым годзе 145 вучняў прынеслі пасведчанне аб базавай адукацыі з адзнакай, гэта больш за палову 9-класнікаў. А на выхадзе ў 2019 годзе былі 72 залатыя медалі і 26 сярэбраных. Зноў жа – амаль палова выпускнікоў скончыла ліцэй з адзнакай.

– Як моцна ўплываюць на прыём падрыхтоўчыя курсы «Вечаровы ліцэй» і сервер дыстанцыйнага навучання ліцэя?

– На курсах навучаецца 1070 вучняў, а ўсяго месцаў для залічэння 264. Ужо сярод слухачоў падрыхтоўчых курсаў складаецца конкурс недзе 4 чалавекі на месца. Сярод тых, хто паступае ў ліцэй, большая частка вучылася на курсах. Але ж проста наведванне «Вечаровага ліцэя» не дае гарантыі паступлення. У конкурсе ўдзельнічаюць не толькі жыхары Мінска, але і абітурыенты з усёй краіны. У мінулым годзе ў ліцэй без уступных іспытаў былі прыняты 40 пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд. Тым не менш курсы і сервер дыстанцыйнага навучання даюць магчымасць больш грунтоўнай падрыхтоўкі. Дзякуючы ім абітурыенты маюць магчымасць лепш падрыхтавацца да ўступных выпрабаванняў.

ВУЧНІ

– Скажыце, ці адрозніваецца ліцэіст ад школьніка? Ці мяняецца характар з паступленнем у ліцэй?

– Па выніках уступнай кампаніі каля 60 % залічаных – гэта выпускнікі гімназій. Яны ўжо праходзяць пэўную селекцыю, яны і раней здавалі іспыты, пры паступленні ў 5 клас, напрыклад. У гімназістаў ёсць база, яны вельмі шмат займаліся, у іх была дапрофільная адукацыя. Ліцэісты БДУ мала адрозніваюцца ад іншых вучняў. Але, на маю думку, ліцэісты ўмеюць задаваць пытанні і шукаць на іх адказы. Заданні цэнтралізаванага тэсціравання (ЦТ) не патрабуюць моцных аналітычных здольнасцяў. Калі мы кажам пра конкурсы даследчых работ, навукова-практычныя канферэнцыі і турніры, то там патрэбныя навыкі крытычнага мыслення. Мне здаецца, у ліцэістаў з гэтым няма праблем, яны ўмеюць шукаць схаваны сэнс.

– На Вашу думку, трэба вучыць усе прадметы альбо толькі тое, што падабаецца?

– Ведаць усё немагчыма, але базавую праграму кожны адукаваны чалавек павінен засвоіць. У нас дзейнічае эксперыментальная блочна-модульная сістэма навучання, якая ўтрымлівае профільны і базавы кампанент. Ліцэісты вучаць усе прадметы, якія ёсць у вучэбным плане, але на вывучэнне няпрофільных прадметаў даецца толькі адзін навучальны год. Умоўна кажучы, фізмат вучыць хімію толькі ў 10 класе, а біялогію толькі ў 11 класе. Двухгадовая праграма змяшчаецца ў год. Такім чынам, мы маем магчымасць павялічыць колькасць гадзін на профільныя прадметы за кошт аптымізацыі колькасці гадзін на няпрофільныя. Але пры такой сістэме нашым навучэнцам было б цяжка вучыцца ў школе, якая працуе па тыпавым плане. Перш за ўсё мэта ліцэя – даць выдатную адукацыю, каб вучні змаглі добра здаць ЦТ, паспяхова ўдзельнічаць у міжнародных спаборніцтвах, рэалізаваць свой патэнцыял і стаць пасля запатрабаванымі ў прафесіі.

– Чацвёртую частку вучняў ліцэя складаюць іншагароднія, якім даецца месца ў інтэрнаце № 2 БДУ. Як у ліцэі падтрымліваюць іншагародніх, якія з'ехалі з бацькоўскага дома?

– Падчас уступнай кампаніі запрашаем бацькоў у другі інтэрнат на экскурсію, каб яны бачылі ўмовы, у якіх будуць жыць іх дзеці. У дадзены момант у ліцэі вучыцца 111 іншагародніх вучняў. Калі паглядзець геаграфію, адкуль да нас прыязджаюць, то больш за ўсё з Мінскай вобласці. Іншыя месцы – Бабруйск, Магілёў, Віцебск, Гомель, Баранавічы. З гэтых гарадоў проста даехаць да Мінска, камунікацыі вельмі добрыя. Зараз іншагароднія не так адарваны ад бацькоў, як гэта было раней. Самастойнасць – вялікі крок наперад, няпроста даводзіцца, калі трапляеш у новыя бытавыя ўмовы. У нас ёсць сацыяльны педагог, два выхавацелі, працуюць вахцёры. Цэлыя суткі ліцэісты пад наглядам. І тут лепш казаць не пра падтрымку, а пра захоўванне дысцыпліны.

НАСТАЎНІКІ

– На Вашу думку, якія рысы павінен мець выдатны настаўнік? За якія заслугі ганарыцеся сваёй камандай?

– Што мне падабаецца ў ліцэйскіх настаўніках, дык гэта вельмі высокая кампетэнтнасць. Іх ведаў хапае не толькі на школьную праграму, але і на ўзровень міжнародных алімпіяд. Яны не будуць чакаць, калі ім дадуць метадычныя рэкамендацыі, а самі зробяць курс, пратэсціруюць і пачнуць выкладаць. Яны здольныя навучаць калег – выкладаюць у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, вядуць курсы ў абласных інстытутах развіцця адукацыі. Гэта творчыя людзі. Яны не баяцца ісці наперад і шукаць адказы. У ПВС ліцэя ўваходзяць выкладчыкі БДУ, больш за 70 % настаўнікаў маюць вышэйшую катэгорыю. Зараз у нас працуюць 9 настаўнікаў-метадыстаў (самая высокая кваліфікацыйная катэгорыя ў настаўнікаў). Ліцэй дае настаўнікам магчымасці развівацца, калектыў мае моцны патэнцыял. Нашы супрацоўнікі з'яўляюцца аўтарамі падручнікаў (напрыклад, фізіка за 10–11 класы, інфарматыка за 6–11 класы, арганічная хімія для 10 класа і інш.). У агульнай колькасці штогод Ліцэй БДУ выдае звыш 8200 асобнікаў дапаможнікаў для абітурыентаў і для падрыхтоўкі да ЦТ. Мы працуем на ўсю сістэму адукацыі. Супрацоўнічаем з Нацыянальным інстытутам адукацыі, Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Арганізоўвалі ў Мінскай вобласці міжнароднае параўнальнае даследаванне па ацэнцы адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA-2018. Міжнародная справаздача аналізуе вынікі 79 краін, уключаючы

звесткі па Беларусі, якая ўпершыню далучылася да даследавання. Нашы выкладчыкі праводзілі тэсты, кадзіравалі адказы, пісалі нацыянальную справаздачу.

– Як заахвочваеце супрацоўнікаў?

– Нашы супрацоўнікі – самая вялікая каштоўнасць. Таму з мінулага года мы ўвялі медыцынскае страхаванне. Страхоўка пакрывае ўсе медпаслугі ў дзяржаўных і камерцыйных установах аховы здароўя. Колькасць прыёмаў не абмежавана, ёсць магчымасць прайсці МРТ, КТ і УГД. У нас ужо застрахавана 74 са 139 штатных супрацоўнікаў (кожны на суму 20 тысяч рублёў). Да верасня, спадзяюся, мы павялічым долю застрахаваных да 100 %. Упэўнены, нашы настаўнікі, вучэбна-дапаможны, гаспадарчы і тэхнічны персанал павінны быць забяспечаны якаснымі медыцынскімі паслугамі. Таксама да 30-годдзя ўвялі знак «За адданасць ліцэю». Ён уручаецца тым, хто больш за 25 гадоў працуе ў нашай установе. Да знака таксама дадаецца медыцынская страхоўка.

– Якімі анлайн-сеткамі карыстаюцца ў ліцэі?

– Ёсць унутраная сетка для абмену данымі паміж настаўнікамі – Basecamp – сэрвіс кіравання праектамі. Дзелімся навінамі, збіраемся ў розныя суполкі па тэмах і задачах. Гэта дазваляе падтрымліваць сувязь і працаваць, абменьваемся дакументамі. Тут сам пішу ўсё, што зрабіў за дзень. А паміж настаўнікамі і вучнямі дзейнічае сэрвіс электронных дзённікаў Schools.by. На ім створаны электронныя журналы і дзённікі, хатнія заданні.

ВУЧНЁЎСКАЕ ЖЫЦЦЁ

– На Вашу думку, што такое «ліцэйскі дух»?

– Яго калісьці ўрачыста пераносілі са старога будынка ў новы ў трохлітровым слоіку. Тут выпусцілі. Лічу, «ліцэйскі дух» – гэта ўзаемапавага паміж вучнямі і настаўнікамі. Мы калегі, мы робім агульную справу. У нас адна мэта – навучыцца. Добразычлівая атмасфера супрацоўніцтва паміж настаўнікамі і вучнямі становіцца ўрадлівай глебай для высокіх дасягненняў у вучобе, навуцы, творчасці. Дзякуючы такому саюзу ў ліцэі склалася шмат цікавых традыцый.

– Дарэчы, якія традыцыі фарміруюць атмасферу ў калектыве?

– Кожны год пачынаецца з таго, што мы збіраем 10 класы напрыканцы жніўня на пасвячэнне ў ліцэісты «Салют, карапузы!». «Карапузамі» называем 10 класы, а 11 класы становяцца «бацькамі». Гэта свята не толькі новых вучняў, але і новых настаўнікаў. Далей праводзім спартыўна-аздараўляльнае мерапрыемства «Турсцяжынка», прэзентацыі класаў – «Візітоўкі», «Улазіны» – навасе лле ў інтэрнаце са шчодрым частаваннем дранікамі. У лютым тры дні святкуем Дзень нараджэння ліцэя, праводзіцца навукова-практычная канферэнцыя, святочны канцэрт, вечар сустрэчы выпускнікоў, спартыўнае свята. Апошні званок – гэта смачнае марожанае з салодкім водарам дзяцінства і традыцыйны футбольны матч з выкладчыкамі. Таксама ў ліцэі штогод святкуюцца Каляды, Масленіца. Стала добрай традыцыяй праводзіць у Ліцэі БДУ спартыўныя спаборніцтвы паміж выкладчыкамі і ліцэістамі. Зараду энергіі і бадзёрасці павінна хапіць на ўвесь навучальны год.

Некаторыя ліцэісты не ўяўляюць жыцця без сцэны, іншыя збіраюць групы па інтарэсах. Існуюць каманды па «Што? Дзе? Калі?» і «Дэбатах», якія неаднойчы станавіліся пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных турніраў. Ёсць камітэт БРСМ, газета «Рукі» і радыё. Існуе вучнёўскае самакіраванне ў выглядзе савета ліцэістаў. Ёсць і сур'ёзны элемент – SCL-конкурс (Summa Cum Laude, з найвышэйшай пахвалой (лац.)), у яго межах дзеці прадстаўляюць прапановы, як палепшыць ліцэй.

Вучні паказваюць самастойнасць у правядзенні ліцэйскіх падзей, шмат чаго арганізоўваюць самі. Мерапрыемствы даюць адчуць сябе часткай цэлага, з гэтых традыцый складаецца ліцэйскае жыццё.

– За 30 гадоў у ліцэі падрыхтавана 220 пераможцаў міжнародных алімпіяд, 1690 прызёраў заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды. Ці лёгка даюцца дыпломы?

– Перамогі даюцца нялёгка. Калі глядзець на рэспубліканскую алімпіяду, мы не можам сабе дазволіць тое, што дазваляюць у іншых установах адукацыі. Вучняў-алімпійднікаў могуць вызваліць на некалькі месяцаў для падрыхтоўкі да заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды. У школах вызваляецца невялікая колькасць вучняў, што ніяк не адбіваецца на адукацыйным працэсе. Ліцэістам цяжэй у гэтым плане. Прыблізна палову ліцэя трэба было б адпускаць на падрыхтоўку да алімпіяды. Гэта ўжо істотная колькасць вучняў, былі б паўпустыя класы. Таму мы іх пачынаем адпускаць з заняткаў толькі за два тыдні, а не за два месяцы. Тым не менш у нашых вучняў атрымліваецца штогод заваёўваць медалі. Што цікава, у такіх умовах найбольш загартаваныя дзеці паказваюць добрыя вынікі. Перамагае наймацнейшы. На трэцім этапе рэспубліканскіх прадметных алімпіяд з Ліцэя БДУ ўдзельнічала 236 чалавек, дыпломы атрымалі 100 з іх. Штогод прыблізна 45 % медалёў, заваяваных вучнямі Рэспублікі Беларусь на міжнародных алімпіядах, прывозяць ліцэісты.

ВЫПУСК З ЛІЦЭЯ

– Колькі ліцэістаў паступае далей у БДУ?

– На працягу апошніх гадоў такія звесткі: з 264 выпускнікоў каля 160 ідзе ў БДУ. Цяпер маем невялікі трэнд на паніжэнне, але мы працуем над тым, каб вярнуцца ў былыя межы. Выпускнікі Ліцэя БДУ разумеюць, што свет вялікі і магчымасцяў шмат. Значная колькасць ідзе ў медуніверсітэт – каля 30 чалавек. Яны прыйшлі ў ліцэй і ўжо абралі медыцыну. Усё менш ліцэістаў абірае іншыя ВНУ Беларусі. Самае цікавае, што апошнім часам павялічваецца колькасць тых, хто едзе вучыцца за межы краіны. У мінулым годзе гэта было 50 чалавек, у асноўным паступалі ў ВНУ Расіі.

– Больш за 30 работнікаў ліцэя – яго выпускнікі. Існуе «Ліга выпускнікоў ліцэя». Значыць, ліцэй – гэта назаўжды?

– З ліцэя цяжка сысці, таму што гэта зусім іншы свет. Мой выпуск 1995 года быў першы, калі зарадзілася традыцыя вяртацца. У нас узнікла думка дапамагаць маладым ліцэістам рыхтавацца да рэспубліканскага турніру юных фізікаў. Цяпер гэта норма, ліцэісты не губляюць сувязі, і пасля выпуску яны яшчэ дапамагаюць рыхтавацца да конкурсаў. Ліцэй БДУ – гэта такая навучальная ўстанова, у якую марыць вярнуцца кожны выпускнік. Прычым вярнуцца для таго, каб падзяліцца сваімі ведамі і досведам, каб працягнуць пачатае, ператварыцца з вучня ў настаўніка. Хто трэніруе каманды Ліцэя БДУ для ўдзелу ў турнірах юных фізікаў і матэматыкаў? Хто займаецца дэбатамі? Хто дапамагае ставіць танцы і пісаць канферанс для розных ліцэйскіх мерапрыемстваў? Учарашнія выпускнікі! Тры з шасці дырэктараў Ліцэя БДУ з'яўляліся яго выпускнікамі. Вось ужо 3 гады мы праводзім прафарыентацыйныя сустрэчы пад назвай «Твой выбар» з выпускнікамі ліцэя, якія дасягнулі значных вынікаў у розных сферах дзейнасці. Сёлета было 4 секцыі, на кожнай па 4–5 выступоўцаў. Такім чынам мы паказваем, што можа чакаць ліцэістаў далей. Да таго ж, шмат хто вяртаецца працаваць, бо хочацца аддаць тое, што даў ліцэй. А ён дае шмат. Дарэчы, 17 настаўнікаў працуе з першага года стварэння ліцэя. Напэўна, у нас усё добра, таму адсюль не хочацца сыходзіць.

БУДУЧЫНЯ

– Якія змены чакаюць ліцэй?

– На маіх вачах з невядомай СШ ён ператварыўся ў самую лепшую ўстанову адукацыі для вучняў, па меркаванні розных рэйтынгаў. Зараз мы імкнёмся, каб кожны вучань знайшоў тут тое, што яму патрэбна. Мы мусім даць ліцэістам магчымасць выбару.

Спачатку было 4 профілі: філалагічны, гістарычны, біёлага-хімічны, фізіка-матэматычны. Першае, што мы зрабілі, – гэта развялі біёлагаў (зараз 2 класы) з хімікамі (1 клас). Такая прафілізацыя дазваляе выкладчыкам хімфака працаваць з ліцэістамі. Зараз каля 14 ліцэістаў з 20 ідзе на хімфак. Ёсць два матклясы і два фізклясы. І адзіны ўнікальны ў сістэме адукацыі Беларусі інфарматыка-матэматычны клас. Пры паступленні здаюць інфарматыку. Гэта адукацыйны эксперымент, і тут самы вялікі конкурс. Гэтыя дзеці складаюць аснову нашай каманды на алімпіядзе і далей ідуць на ФПМІ. Застаўся 1 філклас (абітурыенты факультэтаў журналістыкі і філалагічнага), лінгвістычны (вывучаюць дадаткова дзве мовы), гістарычны клас (упор на грамадазнаўства). У наступным навучальным годзе адкрыем эканамічны клас, дзе асноўнымі прадметамі будуць матэматыка і замежная мова.

Зусім нядаўна MakeIT center адкрыў першы ў Беларусі хакспэйс для ліцэістаў. Якраз пад новую лабараторыю ствараем унікальны інфарматыка-фізічны профіль. У новым кабінеце ўстаноўлена інтэрактыўная дошка з праектарам, 3D-прынтары, спецыяльныя сталы для робататэхнікі, абсталяваныя паяльным абсталяваннем, лаўнжзона. Пад кабінет задумалі цікавы праект для вучняў. Мы плануем на ліцэй распрацаваць сістэму датчыкаў канцэнтрацыі CO_2 у паветры, якая б кіравала інтэрваламі праветрывання ў класах.

Новыя профілі з'яўляюцца пасля шматбаковага аналізу спалучэнняў прадметаў, якія выпускнікі Ліцэя БДУ выбіраюць на цэнтралізаваным тэсціраванні. У выніку падобнага аналізу ствараецца структура ліцэя, якая ўвасабляе ў сабе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у мініяцюры. Кожны клас знаходзіць роднасны факультэт ці інстытут. Пры гэтым для вучняў будуецца індывідуальная адукацыйная траекторыя, дзе ліцэй з'яўляецца толькі першай прыступкай у пабудове паспяховай кар'еры.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

ЛІЦЭЙ БДУ Ў ЛІЧБАХ

- Ліцэй БДУ ўтвораны ў **1989** годзе, а першыя заняткі прайшлі ў студзені 1990 г.
- Навучаецца больш за **520** ліцэістаў.
- Ліцэй мае **10** педагагічных кафедраў, **24** класы, **30** кабінетаў, **2** камп'ютарныя класы, **2** лекцыйныя залы з новым праекцыйным абсталяваннем, канферэнц-залу, актавую, спартыўную, трэнажорную, канцэртную і харэаграфічную залы. Ва ўстанове ёсць зімовы сад і сталовая.
- За 30 гадоў ліцэй падрыхтаваў каля **7000** выпускнікоў.
- Па статыстыцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, кожны дзясяты 100-бальны вынік на ЦТ атрымліваюць выпускнікі Ліцэя БДУ.
- Больш за **1500** разоў навучэнцы і настаўнікі ліцэя адзначаны спецыяльным фондам Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.
- Ліцэй – самы наведавальны пункт у Мінску па РТ. **57 %** вучняў пішуць РТ у ліцэі БДУ. Цалкам увесь комплекс БДУ займае ¾ ад месцаў здачы РТ.

УНІВЕРСІТЭТ
27 лютага 2020 года, № 4 (2226)

Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ад зніжэння слыху пакутуюць каля 500 мільёнаў чалавек, і іх колькасць з кожным годам расце. Як беларускія навукоўцы сумесна з медыкамі распрацавалі матэматычную мадэль, з дапамогай якой праводзяцца аперацыі па паляпшэнні слыху, распавёў дэкан механіка-матэматычнага факультэта БДУ доктар фіз.-мат. навук **Сяргей БАСЯКОЎ.**



Цвёрдацельная мадэль сярэдняга вуха з усталяваным на задняверхні квадрант храстковым трансплантантам

Даведка

Басякоў Сяргей Міхайлавіч нарадзіўся ў 1973 г. у Брэсце. У 1995 г. атрымаў дыплом з адзнакай Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута па спецыяльнасці «матэматыка і фізіка». З 1994 па 1999 г. працаваў настаўнікам фізікі і матэматыкі ў гімназіі № 4 г. Брэст, а з 1999 па 2003 – асістэнтам кафедры супраціўлення матэрыялаў і тэарэтычнай механікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. У 1999 г. паступіў у аспірантуру механіка-матэматычнага факультэта БДУ. З 2003 па 2020 г. працаваў на кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі ММФ БДУ.

У 2002 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Метад характарыстык у механіцы дэфармаванага цвёрдага цела». У 2005 г. яму было прысвоена навуковае званне дацэнта. А ў 2019 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Матэматычнае мадэляванне шчыльных злучальных тканак і біямеханічных сістэм чалавека ў натуральным і паталагічным станах».

Біямеханікі з БДУ дапамагаюць вярнуць слых

Нюансы тымпанапластыкі

Нядаўна Сяргей Міхайлавіч атрымаў грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2020 год у галіне навукі і адукацыі. Штомесячная фінансавая падтрымка накіравана на распрацоўку методыкі прагназавання геаметрычных параметраў храстковых трансплантантаў, якія ўсталёўваюцца на барабанную перапонку сярэдняга вуха пры лакальнай тымпанальнай пластыцы для паляпшэння слыхавой праводнасці ў пацыентаў з паталогіяй сярэдняга вуха. Пра прадмет даследавання навуковец распавядае так:

– Нармальнай працы слыхавога апарата замінае праблема, звязаная з утаварэннем рэтракцыйнай кішэні барабаннай перапонкі сярэдняга вуха. Праблема заключаецца ў тым, што пры паталагічных зменах барабаннай перапонкі могуць істотна павялічвацца яе прагіны. Пад дзеяннем гукавога ціску барабанная перапонка пачынае «прыліпаць» (г. зн. датыкацца) і зрошчвацца з косткамі сярэдняга вуха, якія адказныя за перадачу сігналу ва ўнутранае вуха. Гэты працэс праходзіць бессімптомна і бязбольна. Пасля гэта можа выклікаць тугавухасць, пагаршэнне слыхавой праводнасці. Як паказвае практыка, часцей за ўсё менавіта ў дзяцей назіраецца такая паталогія.

Для прадухілення ўтварэння рэтракцыйнай кішэні і павелічэння прагінаў барабаннай перапонкі прымяняюць аперацыю пад назвай тымпанапластыка, адзін з этапаў якой заключаецца ва ўстаноўцы храстковага трансплантанта на пэўную частку барабаннай перапонкі для павелічэння яе цвёрдасці. Але пры гэтым захоўваецца гнуткасць ваганняў перапонкі з тым, каб сігнал адэкватна перадаваўся ва ўнутранае вуха. Сам трансплантант выразаецца з казялка – гэта невялікі храстковы выступ у пярэдняй частцы вушной ракавіны, яму надаюць пэўную таўшчыню і форму. На сёння такія аперацыі, якія на ранняй стадыі дапамагаюць чалавеку захаваць якасць слыху, праводзяцца часта.

«У Беларусі няма аналага падобным распрацоўкам»

– Паўстала задача, у рамках якой мы ўзаемадзейнічаем з атоларынгалагамі, сумесна з імі фармулюем рэкамендацыі па правядзенні тымпанапластыкі. Задача заключаецца ў тым, што трэба ўсталяваць храстковы трансплантант такой таўшчыні, якая дазволіла б пазбегнуць істотных перасоўванняў барабаннай перапонкі, каб не было вялікіх прагінаў, якія прыводзяць да дотыку і зрошчвання з косткай, – гаворыць дэкан мехмата.

Навукоўцы БДУ распрацавалі камп'ютарную мадэль, якая дазваляе шляхам апрацоўкі даных клінічных назіранняў і аўдыяграмы рэальных пацыентаў разлічыць таўшчыню храстковага трансплантанта, неабходнага для аднаўлення функцый сярэдняга вуха. Біямеханікі грунтуюцца на параўнальным аналізе частот свабодных ваганняў сярэдняга вуха ў норме і сярэдняга вуха з паталогіяй і ўсталяваным храстковым трансплантантам.

– У нас ёсць інструкцыя ад Міністэрства аховы здароўя па выпадках узнікнення на ранняй стадыі рэтракцыйнай кішэні, дзе мы даём рэкамендацыі ўжо на тым этапе, калі варта ці немэтазгодна прымяняць тымпанапластыку. Мы даём разлікі, калі аперацыя прывядзе да кампенсацыі слыхавой праводнасці на пэўным спектры частот ці ў якім выпадку яна можа стопрацэнтна пакрыць ускладненні, – дзеліцца навуковец мехмата.

Сяргей Басякоў адзначае, што атрыманая мадэль арыгінальная, у Беларусі няма аналага падобным распрацоўкам. Яе асаблівасць у тым, што навукоўцам удалося зрабіць мадэль такой слаістай структуры, якая адпавядае анатамічным асаблівасцям размеркавання таўшчыні рэальнай барабаннай перапонкі сярэдняга вуха. А менавіта размеркаванне таўшчыні з'яўляецца ключавым элементам у яе паводзінах. Маючы мадэль, якая адпавядае анатамічным нюансам, магчыма вырашаць разнастайныя задачы па механічным уздзеянні, дынамічных паводзінах сістэмы сярэдняга вуха.

Як падкрэслівае навуковец, тут неабходна працаваць у кантакце з медыкамі. У стварэнні мадэлі выкарыстоўваецца тэхналогія, паслядоўнае выкананне якой дазваляе атрымаць канчатковую элементную мадэль, на якой праводзяцца статычныя ці дынамічныя разлікі. Сяргей Басякоў працягвае:

– А паслядоўнасць заключаецца ў тым, што мы бяром высокадакладную тамаграфію сярэдняга вуха і затым праз праграму апрацоўкі медыцынскіх выяў аднаўляем геаметрычную мадэль, апрацоўваем яе, каб атрымаць так званую цвёрдацельную мадэль. Яна дазваляе перайсці на канчатковы элемент разліковай мадэлі. Перапонка вельмі тонкая, яе таўшчыня ў сярэднім складае каля 100 мікраметраў – уся сістэма сярэдняга вуха вельмі маленькая, што дае дадатковыя складанасці ў працы. І нават на высокадакладнай тамаграфіі ёсць некаторыя ўчасткі, дзе атрымліваюцца прасветы. Каб адпавядаць паверхні перапонкі, мадэль дабудоўваецца да патрэбнай геаметрычнай непарыўнай формы. Гэта дазваляе атрымаць рознае размеркаванне таўшчыні па паверхні ўсёй перапонкі.

Дэкан мехмата разважае, што будуць цікавыя вынікі даследаванняў у рамках гранта, таму што навукоўцы ахопліваюць яшчэ больш варыянтаў паталогій. У планах – распрацаваць самастойную камп'ютарную праграму, у якой можна было б закласці вынікі абследаванняў пацыентаў, лабараторных і амбулаторных даследаванняў, а затым атрымаць рэкамендацыі па тым, як належыць праводзіць тымпанапластыку. Плануецца аформіць вынікі ў тым ліку і для абгрунтавання інавацыйнага праекта Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях.

«У гэтай працы задзейнічана шмат удзельнікаў»

Атрыманы вынік стаў магчымым дзякуючы калектыўнай працы навукоўцаў БДУ і медыкаў. Праца ішла з удзелам загадчыка кафедры бія- і нанамеханікі *Генадзя Міхасёва*, дацэнта ММФ *Кірыла Юркевіча*, прафесара Белмедакадэміі паслядыпломнай адукацыі *Людмілы Пятровай* і спецыялістаў РНПЦ отарыналарынгалогіі *Марыны Майсюк* і *Юліі Яроменка*. Да таго ж грант выконваецца з прыцягненнем аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў.

– Отарыналарынголагі самі звярнуліся да нас з пытаннем, як можна распрацаваць спецыяльную мадэль. Мы ў сваю чаргу вывучылі медыцынскія абследаванні, зрабілі ўвесь комплекс прац па мадэляванні, давялі да ладу геаметрычную форму, мадэль самой мембраны, улічылі нюансы ў размяшчэнні ўсіх гэтых элементаў, – распавядае Сяргей Басякоў. – Гэта перспектыўны напрамак, таму што асноўныя праблемы са слыхам часцей за ўсё ўзнікаюць менавіта ў сярэднім вуху. Студэнтам вельмі цікавая гэта сфера, яны актыўна ўключаюцца ў працу. Дарэчы, пры падзеле патоку спецыяльнасці «механіка і матэматычнае мадэляванне» на чатыры спецыялізацыі большасць імкнецца патрапіць менавіта на «біямеханіку». Я іх разумею, таму што гэта актуальны і перспектыўны напрамак, які развіваецца на стыку навук: механікі, медыцыны і матэматыкі. Так, фундаментальных адкрыццяў тут практычна няма, таму што выкарыстоўваюцца ўжо існуючыя законы механікі. Але ў той жа час навуковец вырашае канкрэтную задачу, прыходзіць да новай мадэлі з унікальнымі ўласцівасцямі, якая разлічваецца па новых падыходах і тэхналогіях. Атрымліваецца вынік, які выкарыстоўваецца на практыцы, трапляе да ўрачоў у выглядзе праграм і рэкамендацый, дапамагае людзям.

Іншыя праекты біямеханікаў з БДУ

На кафедры мехмата вядуцца і іншыя праекты па медыцынскай тэматыцы. Напрыклад, працягваецца праект «віртуальнай» кісці, над якім працуюць Сяргей Басякоў і траўматолаг-артапед Мінскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай меддапамогі Антон Петухоўскі. Мэта працы – дапамагчы ўрачам аднавіць у пацыента функцыі кісці пасля траўмы з разрывам сухажылля. Пры дапамозе «віртуальнай» кісці можна загадзя пралічыць, якая аперацыя дасць найлепшы эфект. Праграма робіць разлік і паказвае, як будуць паварочвацца фалангі пальцаў пад дзеяннем нагрузкі на сухажыллі пасля таго ці іншага варыянта хірургічнага ўмяшання.

Актыўна супрацоўнічаюць з кафедрай артапедычнай стаматалогіі і артадантыі з курсам дзіцячай стаматалогіі БелМАПА па даследаванні сківіц для далейшага мадэлявання паводзін і функцыянавання зубных імплантатаў. Перад біямеханікамі стаіць задача атрымаць максімальна дакладныя мадэлі сківіц, імплантатаў, размеркаванне касцяной тканкі – і звесці ўсё разам.

Ідзе супрацоўніцтва з РНПЦ траўматалогіі і артапедыі па прагназаванні паводзін і трываласці костак пасля аперацый. Таксама да навукоўцаў БДУ звярнуліся расійскія медыкі з Навакуйбышаўскай цэнтральнай гарадской бальніцы па праектаванні канструкцый інтрамедулярных імплантатаў, якія накладваюцца на сцягно, каб пазбегнуць пералому шыйкі сцягна пры астэапарозе і ўзроставых зменах.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

«Трэба змяніць погляд на лідарства»

Студэнцкае лідарства не глабальныя лозунгі і вынікі «для галачкі». Гэта становіцца ясна з размовы са студэнтам філалагічнага факультэта **Гадамам ЧАРЫЕВЫМ.** Ён ужо некалькі месяцаў узначальвае Савет зямляцтваў БДУ і імкнецца зрабіць арганізацыю больш патрэбнай і карыснай для замежных студэнтаў. 21-гадовы хлопец падзяліўся з газетай «Універсітэт» сваімі поглядамі на адукацыю і самакіраванне.

Я тут – і гэта найлепшы адказ

У Беларусі Гадам ужо трэці год. Гэты тэрмін ён лічыць паказальным і шчыра дзівіцца пытанням пра тое, ці падабаецца яму вучыцца і жыць у Беларусі.

– Калі б мне не падабалася, мяне б тут ужо не было! У свеце столькі магчымасцяў, зараз перавесціся і пераехаць у іншую краіну нашмат лягчэй. Я тут – і гэта найлепшы адказ.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт «пераважыў» у выбары паміж найлепшымі ВНУ Расіі, Украіны і Цэнтральнай Еўропы. Гадама вырашылі адправіць вучыцца за мяжу па распаўсюджанай туркменскай практыцы: адно дзіця адпраўляюць у замежжа, іншае пакідаюць вучыцца «ў сябе». Малодшая сястра працягвае справу сям'і, вучыцца ў туркменскім універсітэце. Гадам вырас і вывучыўся ў вёсцы Этбаш на ўсходзе краіны, на вакацыі прыязджае ў сталіцу Ашгабад.

У замежнага студэнта прыродная схільнасць да моў: ён хутка вывучыў рускую, павысіў узровень англійскай, а па спецыяльнасці вывучае і французскую. Дарэчы, да паступлення ў БДУ ён не ведаў ні пра гугл-формы, ні пра сам «Гугл». Уся справа ў спецыфічнай інфармацыйнай палітыцы Туркменістана, якая абмяжоўвае доступ да звыклых для Беларусі сацыяльных сетак і рэсурсаў.

– Таму для ўсіх, хто вучыцца за мяжой, свет становіцца шырэйшым! Гэта заўсёды ўражвае. Адгэтуль і мая любоў да вандраванняў, імкнуся адпраўляцца ў незнаёмыя і цікавыя месцы, як толькі з'яўляецца магчымасць. Да таго ж, з саветам зямляцтваў два разы ў год мы ездзім у экскурсійныя паездкі па Беларусі.

Прыгажосць мовы

У лінгвістычным багажы Гадама пяць моў: туркменская, руская, англійская, французская і турэцкая.

– Французская для мяне гучыць вельмі хораша і рамантычна. Нядаўна я з сям'ёй ездзіў у Парыж, дзе чуў жывую мову і размаўляў з французамі. Але я ведаю англійскую, на факультэце павысіў яе ўзровень. Два гады запар удзельнічаў ва ўніверсітэцкім міжнародным форуме «M.I.P.», дзе англійская з'яўляецца працоўнай. Ён прысвечаны рашэнню моладзевых і глабальных праблем, на яго прыязджаюць студэнты не толькі з розных універсітэтаў Беларусі, але і з розных краін.

Гадам лічыць сваіх выкладчыкаў даволі патрабавальнымі, што і дапамагае добра засвойваць матэрыял. Аднак ёсць і іншы бок – некаторыя замежныя студэнты расслабляюцца і не прыкладаюць дастатковых высілкаў, каб вучыцца на выдатна, лічачы для сябе прымальнымі мінімальныя адзнакі. З боку выкладчыкаў хлопец не заўважыў прадузятасці, толькі добры гумар, роўнае стаўленне, як і да беларускіх студэнтаў.

Акрамя навучальнай і мастацкай праграмай літаратуры, ён любіць чытаць папулярны цяпер нон-фікшн, кнігі па самаразвіцці.

– На занятках нам растлумачылі, што навучыць замежнай мове студэнта можна, добра разумеючы яго родную мову. Калі вучу замежныя мовы, у тым ліку рускую, адштурхоўваюся ад пабудовы туркменскай, бо яна мне добра знаёмая. Так вучаць мовы і ўсе іншыя людзі, шляхам параўноўвання. Вялікая частка студэнтаў, якія прыязджаюць з Сярэдняй Азіі, распачынае вучобу адразу ж, не вывучаючы рускую год на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі. З-за гэтага ім складана адаптоўвацца не толькі да навучальнага працэсу, але і жыцця ў інтэрнаце. Для гэтага савет зямляцтваў разам з ССЯА стварыў спецыяльныя бясплатныя курсы рускай мовы як замежнай, якія праходзяць у розных карпусах універсітэта.

Паспяхова прайшлі два патокі, а ў сакавіку адкрыецца трэці. Выкладчыкі – беларускія і замежныя студэнты, якія паспяхова засвоілі мову, якія, ведаючы асаблівасці роднай, могуць даходліва растлумачыць рускую.

Дарэчы, Гадам гаворыць, што беларусы не моцна адрозніваюцца ад туркменаў. А вывучыў ён і студэнтаў, і выкладчыкаў добра, бо 90 % заняткаў праходзяць з беларусамі. І яны заўсёды гатовыя дапамагчы з навучальнымі пытаннямі і падтрымаць гутарку. Але ўсё ж гэтых зносін бракуе.

Задачы, якія можна вырашыць

– Хацелася б больш размаўляць з беларусамі. У інтэрнаце № 7, напрыклад, замежных студэнтаў селяць на адным паверсе. Вядома ж, у мяне з'явіліся добрыя сябры-землякі тут. Але я бачу, як нам бракуе практыкі рускай. Мы ж прыехалі ў Беларусь, каб вучыць мовы, а калі жывеш са «сваімі», няма такога асяроддзя, дзе хутка засвоіш рускую. Некаторыя замежныя студэнты добра ўжываюцца з беларусамі, а іншым камфортней са сваімі. Магчымасць вырашыць гэту цяжкасць ёсць – я магу прыйсці да адміністрацыі, магу падняць пытанне на сходзе Асамблеі БДУ. Аднак я папытаў – не ўсе замежныя студэнты хочуць змяняць такое становішча. Таму знайшоў іншае рашэнне: мы запусцілі для іх бясплатныя курсы рускай мовы.

На пасадзе старшыні савета зямляцтваў Гадам менш за паўгода, а ў арганізацыі з першага курса быў намеснікам. Ён ведае, што і навошта, і збіраецца паказаць, што савет здольны не толькі арганізоўваць вольны час замежных студэнтаў, але і дапамагаць з рашэннем пытанняў:

– Шмат у каго ёсць уяўленне, што савет зямляцтваў – гэта толькі культурна-масавыя мерапрыемствы. Раней так і было, але гэта толькі частка нашай працы. Савет зямляцтваў, безумоўна, можа дапамагчы студэнтам вырашаць цяжкасці. Кіраўніцтва ўніверсітэта адкрытае для прапаноў, і кожны раз мяне ўважліва выслухоўвалі і прапаноўвалі шляхі рашэння. Мае звароты і пытанні ні разу не былі праігнараваны. Але ж і складанасці бываюць розныя. Высяленне з інтэрната за грубае парушэнне правілаў – і тут савет дапамагчы не можа, бо гэта дакладна аб'ектыўная прычына.

Пра Гадама распавяла Кацярына ШАЙКО, сацыяльны педагог аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ:

– Гадам – гэта старанны, адказны студэнт, які бачыць крыху далей. Гэта важная якасць, калі ты не замкнуты ў сваіх абмежаваннях, а рэальна пашыраеш уласныя межы і магчымасці і сваёй каманды. Савет зямляцтваў пры Гадаму мае шмат ідэй, якія яны хутка ўвасабляюць. Як чалавек ён стараецца дапамагчы або прапанаваць рашэнне любому, хто да яго звяртаецца. Сапраўды, Гадам стараецца зрабіць савет папулярным у асяроддзі студэнтаў, ён адзін з нямногіх старшыняў, хто праводзіць асабістыя сустрэчы ў інтэрнаце і на факультэтах. Ён не хаваецца і заўсёды гатовы гаварыць і адказваць на пытанні, што вельмі важна для кіраўніка студэнцкай арганізацыі. Жадаю яму поспехаў, і ўпэўнена ў яго вялікім патэнцыяле, які раскрыецца ў найбліжэйшы час.

Надзея МАРХЕЛЬ

Тры старшыні Савета зямляцтваў БДУ: (справа налева) Гадам Чарыеў, Тахірджон Аліеў, Умеджон Хамдамаў

Візітоўка

- Гадам вельмі любіць падарожнічаць у розныя краіны.
- Штодня чытае навіны, каб нічога не прапусціць.
- Любіць смачна паесці, з беларускай кухні падабаюцца дранікі і бульба па-вясковаму.
- Ходзіць на ўсе спецыялізаваныя выставы-кірмашы, якія праводзяцца ў Мінску.
- Да любімых кніг імкнецца ўзяць аўтограф.

Перамога ў футбольным турніры

Курсы рускай мовы на ФМА

Даведка

Савет зямляцтваў БДУ – агульнаўніверсітэцкі орган студэнцкага самакіравання замежных студэнтаў. На дадзены момант налічвае 212 сяброў у пяці нацыянальных зямляцтвах: туркменскім, рускім, азербайджанскім, кітайскім і таджыкскім. У гэтым годзе савет адзначыць сваё дзесяцігоддзе.

УНІВЕРСІТЭТ
27 лютага 2020 года, № 4 (2226)

«Вакацыі з сябрамі» для замежных студэнтаў

Вакацыі – гэты час для адпачынку, яркіх уражанняў, станоўчых эмоцый і магчымасць сустракацца з сябрамі. Але што рабіць, калі твае знаёмыя знаходзяцца за тысячы кіламетраў ад цябе? Выйсце з гэтай сітуацыі знайшлі спецыялісты псіхалагічнай службы. Яны падрыхтавалі для замежных студэнтаў праграму «Вакацыі з сябрамі». Хлопцы і дзяўчаты змаглі палепшыць свае моўныя навыкі, весела правесці час і завесці новыя знаёмствы.

Вельмі важна, знаходзячыся ў іншай краіне, ведаць яе законы і правілы знаходжання. З гэтай мэтай для замежных студэнтаў была арганізавана сустрэча з інспектарам АГІМ Маскоўскага раёна.

Гаворка ішла пра асноўныя правілы паводзін у горадзе і на тэрыторыі студэнцкай вёскі, пра афармленне дакументаў пры выездзе на вакацыі, рэгістрацыі, адкрыцці і падаўжэнні візы. «Ці можа замежнік працаваць падчас вучобы? На працягу якога тэрміну ён павінен апавясціць службы пра пераезд? За якія парушэнні яго могуць дэпартаваць?» Гэтыя і шматлікія іншыя пытанні цікавілі студэнтаў.

Экскурсія па беларускай сталіцы стала адпраўным пунктам вакацый. Студэнты пазнаёміліся з галоўнымі славутасцямі Мінска і яго архітэктурай, а таксама даведаліся пра асноўныя вехі гісторыі горада. Знакавым стала наведванне Алеі Дружбы.

Дапоўніць экскурс у гісторыю дапамог «Візіт сяброў у музей гісторыі БДУ». Студэнты змаглі азнаёміцца з гісторыяй універсітэта, даведацца пра цікавыя факты і дасягненні.

Пасля займальнага знаёмства з універсітэтам і сталіцай супрацоўнікі псіхалагічнай службы арганізавалі інтэрактыўныя мерапрыемствы, дзе студэнты набылі карысныя навыкі эфектыўнага ўзаемадзеяння.

Больш даведацца пра невербальныя спосабы выражэння сяброўскіх пачуццяў у розных народаў студэнты змаглі на гасцёўні «Сяброўства без слоў». Бо культура кожнай краіны развіваецца па сваіх законах і ў кожнай краіне ёсць свае асаблівасці невербальных зносін. Кожны жэст можа быць вытлумачаны інакш чалавекам іншай культуры. Таму вельмі важна быць правільна зразуметым.

На мерапрыемстве «Я і мае сябры» можна было праз творчасць выказаць свае эмоцыі, зразумець свае запатрабаванні і ў псіхалагічна бяспечнай атмасферы адкрыцца новым людзям. Зразумець іх свет, даведацца, што не такія мы розныя, як нам здаецца. Нам усім патрэбныя сябры, мы хочам быць прынятымі, хочам падзяліць з кімсьці нашы эмоцыі і падзеі жыцця. Удзельнікі малявалі пра сяброўства і гаварылі пра тыя якасці ў сябрах, якія каштоўныя для любога чалавека. І праз гэта ўсё яны станавіліся больш блізкімі і зразумелымі адзін аднаму.

Са здзіўленнем для сябе навучэнцы адкрывалі тое, што, жывучы ў розных культурах і розных краінах, у адным пакоі сабраліся людзі, якія любяць ездзіць на рок-фэсты, гуляць у баскетбол, любяць адных і тых жа персанажаў фільмаў, сумуюць па сябрах з родных гарадоў, смяюцца з адных і тых жа жартаў, бянтэжацца перад новымі людзьмі.

Самае каштоўнае, што адбывалася падчас гасцёўні, – гэтыя жывыя зносіны і шчырая цікавасць адзін да аднаго. Так шаблонныя ўяўленні і стэрэатыпы сціраюцца, а межы «адрозненняў» становяцца ўмоўнымі. І студэнт з Кітая прапануе прынесці гітару і паспрабаваць усім праспяваць што-небудзь. Гэта і ёсць аб'яднанне і, магчыма, пачатак сяброўства.

Гасцёўня «Гарбата з сябрамі» дазволіла ўсім сабрацца зноў ва ўтульнай атмасферы беларускага застолля і падзяліцца сваімі ўражаннямі пра вакацыі адзін з адным. Духмяны скрыпень стаў разыначкай сустрэчы. Навучэнцы даведаліся падрабязней пра традыцыі чаявання іншых краін і беларускія чаі з зёлак. Меліса, ліпа, шыпшына і нават пладаножкі клубніц – усё гэта можа стаць асновай смачнага і карыснага напою.

Спадзяёмся, што такія вакацыі стануць новай традыцыяй у жыцці замежных студэнтаў у Беларусі.

Дзякуючы дадзеным мерапрыемствам, на базе псіхалагічнай службы (Чурлёніса, 7) была арганізавана арт-прастора, якая дзейнічае ўвесь час.

Сваімі ўражаннямі пра мерапрыемствы падзяліліся студэнты з Кітая і Туркменістана:

Чжан Цзунцянь: «Я быў перакладчыкам на гэтых мерапрыемствах. Так, я яшчэ не вельмі добра ведаю рускую мову, але я шмат яе вывучаў. Я ведаю, што, калі буду гаварыць з іншымі людзьмі па-руску больш, мова не будзе такой складанай.

Я быў вельмі рады прыняць удзел у гэтай праграме. Яна вельмі цікавая і добрая. Сяброўскія зносіны дазволілі людзям пазнаёміцца адзін з адным. На занятках я даведаўся новую інфармацыю. Напрыклад, як бачаць сяброўства іншыя людзі, якая гісторыя ў БДУ і г. д.

Я лічу, што студэнтам трэба больш удзельнічаць у падобных мерапрыемствах, каб знаёміцца адзін з адным. Замежнікам патрэбныя беларускія сябры, якія змогуць дапамагаць ім. Я спадзяюся, што ў наступны раз падобныя мерапрыемствы наведае яшчэ больш людзей».

Інер: «Я вучуся на 1 курсе юрыдычнага факультэта. Я ўсяго толькі паўгода ў Мінску, і першы час без бацькоў і сяброў было складана. Не вельмі добра гавару па-руску. Псіхалагічная служба запрасіла мяне прыняць удзел у „Вакацыях з сябрамі“». Там я пазнаёміўся са студэнтамі з іншых краін. Я даведаўся пра гісторыю Мінска і БДУ. Паразмаўляў з іншымі студэнтамі і атрымаў выдатную моўную практыку».

Ірына ПАПОК,
Дзіна ЛУКАШЭВІЧ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам
інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

27 лютага 2020 года
Падпісана да друку 24.02.2020 г.
Зак. 43. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by